# ДЗЕЙНАСЦЬ РЭГІЯНАЛЬНЫХ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ФУНКЦЫІ ДАКУМЕНТАВАННЯ

*Бамбешка Іванна Іванаўна,*
*старшы выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*г. Мінск*

Сучасны свет характарызуецца значнай колькасцю адкрыццяў і катаклізмаў, што непазбежна прыводзяць да страты ўстойлівых ідэалаў, трансфармацыі светапоглядаў, змене ідэалогій. У такой сітуацыі пастаянных перамен абсалютна натуральным для чалавека з'яўляецца пошук свайго месца ў навакольным асяроддзі, усведамленне сваіх каранёў. Такія абставіны стымулююць рост цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны і музеяў, як месца яе канцэнтрацыі, захавання, вывучэння і актуалізацыі.

Сучасная музейная сетка Рэспублікі Беларусь прадстаўлена гістарычнымі, мастацкімі, літаратурнымі, комплекснымі і іншымі музеямі. Пераважную большасць складаюць комплексныя музеі, а больш канкрэтна – краязнаўчыя. Паводле афіцыйнай статыстыкі толькі ў сістэме Міністэрства культуры ў пачатку 2018 г. дзейнічала 150 музеяў, з якіх комплексныя складалі 57%, гістарычныя – 28%, мастацкія – 10%, літаратурныя – 5% [1]. Па нашых падліках, 84 (56%) музеі з'яўляюцца краязнаўчымі, якія дзейнічаюць ва ўсіх абласных гарадах краіны, у многіх раённых цэнтрах, а таксама шэрагу населеных пунктаў гарадскога і пасялковага ўзроўню. Сучасная музеялагічная навука характарызуе краязнаўчыя музеі як музеі, зборы якіх дакументуюць розныя бакі жыцця (прыродныя ўмовы, гістарычнае развіццё, эканоміку, побыт, культуру) канкрэтнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна ці населенага пункта (рэспублікі, края, акругі, вобласці, горада, раёна, вёскі) і складаюць частку яго прыроднай і культурнай спадчыны [2, стар. 298].

Феномен краязнаўчага музея раскрываецца не толькі праз яго вызначэнне, але і праз тыя функцыі, якія ён выконвае ў адносінах да грамадства, культуры, асобы. Айчынныя і замежныя даследчыкі вылучаюць функцыі дакументавання, адукацыйна-выхаваўчую, рэкрэацыйную, камунікацыйную, рэпрэзентатыўную, інфармацыйную, эстэтычную і іншыя. Пры ўсёй разнастайнасці меркаванняў і поглядаў да базавых сацыяльных функцый музея можна аднесці функцыю дакументавання рэальнасці, адукацыйна-выхаваўчую і рэкрэацыйную.

У адносінах да грамадства і культуры музей выконвае функцыю дакументавання. Яна прадугледжвае мэтанакіраванае адлюстраванне ў му-

зейным зборы праз музейныя прадметы розных фактаў, падзей, працэсаў і з'яў, што адбываліся ў жыцці пэўнага геаграфічнага рэгіёна (вобласці, раёна ці горада), якія вывучае музей у адпаведнасці са сваім месцам у музейнай сетцы і комплексным характарам. Сутнасць музейнага дакументавання заключаецца ў тым, што музей выяўляе і адбірае аб'екты прыроды і створаныя чалавекам прадметы, якія могуць выступаць сапраўднымі сведчаннямі аб'ектыўнай рэальнасці. Пасля ўключэння прадметаў музейнага значэння ў музейны збор яны становяцца знакамі і сімваламі канкрэтных падзей і з'яў, што ў яшчэ большай ступені раскрываецца ў працэсе вывучэння і навуковага апісання прадмета. Названая функцыя рэалізуецца галоўным чынам у такіх відах музейнай дзейнасці, як камплектаванне фондаў, іх вывучэнне і захаванне.

Характэрнай рысай краязнаўчых музеяў з'яўляецца універсальны характар фондаў. Таму ў кожным рэгіянальным краязнаўчым музеі дзяржавы створаны калекцыі археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі і баністыкі, дакументальных крыніц, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, прадметаў натуральнага паходжання і г.д. Па нашых падліках у фондах айчынных краязнаўчых музеяў захоўваецца каля 2 млн. прадметаў асноўнага фонду. Сярод рэгіянальных краязнаўчых музеяў найбольш значнымі па аб'ёме з'яўляюцца фонды Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (219 824 адзінак захавання асноўнага фонду), Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (197 587 адзінак), Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея (173 927 адзінак) і інш.

Нягледзячы на комплексны характар збораў краязнаўчых музеяў, іх змест у кожным музеі індывідуальны. Сабраныя прадметы характэрныя менавіта для дадзенай тэрыторыі, і таму маюць свае асаблівасці. Найбольш выразна індывідуальны характар збораў краязнаўчых музеяў праяўляецца ў калекцыях этнаграфіі і археалогіі, прадметы з якіх увасабляюць лакальныя асаблівасці. Сучасныя этнаграфічныя калекцыі рэгіянальных краязнаўчых музеяў Беларусі пачалі фармавацца пераважна ў пасляваенны час. Актыўнае папаўненне музейных фондаў прадметамі этнаграфічнага характару было выклікана шэрагам фактараў. Па-першае, гэта развіццё этнаграфічнай навукі і зацікаўленасць даследчыкаў у фармаванні крыніцазнаўчай базы навукі. Па-другое, урбанізацыя, актыўнае будаўніцтва шматкватэрных дамоў, пашырэнне выпуску тавараў шырокага ўжытку (мэбля, адзенне, посуд і інш.) садзейнічала з'яўленню вялікай колькасці прадметаў музейнага значэння этнаграфічнага характару, якія выйшлі з ужытку і перасталі выконваць сваё ўтылітарнае значэнне. Па-трэцяе, у савецкі перыяд этнаграфічныя прадметы другой паловы XIX – першай паловы XX ст. павінны былі яскрава дэманстраваць перавагі сацыялістычнага ладу жыцця. Дзякуючы гэтым і іншым

прычынам у рэгіянальных краязнаўчыя музеях былі сфармаваны даволі значныя калекцыі прадметаў этнаграфіі.

Асноўная частка этнаграфічных прадметаў рэгіянальных краязнаўчых музеяў датуецца канцом XIX – першай паловай XX ст. Дакументаванне побыту савецкага перыяду не знайшло шырокага адлюстравання ў музейных калекцыях. Прадметы побыту другой паловы XX ст. уяўляюць адзінкавыя рэчы, якія ўяўляюць своеасаблівыя сімвалы эпохі (джынсы, школьная форма, чамаданы і дыпламаты савецкіх чыноўнікаў 1950–1980-х гг.). Аднак у апошнія дзесяцігоддзі сітуацыя пачала змяняцца. Так, Лідскі гісторыка-мастацкі музей, працуючы над экспазіцыйным рашэннем выставы «Хрушчоўка 60-х», на працягу некалькіх гадоў сабраў унікальны комплекс аўтэнтычных прадметаў, якія дакументуюць побыт савецкіх гараджан 1960-х гг.

Яшчэ адной характэрнай асаблівасцю рэалізацыі функцыі дакументавання стала ліквідацыя «белых плям» у лакальнай гісторыі. Змяненне палітычнай кан'юнктуры, паслабленне цэнзуры з боку кіруючых органаў стымулявала збор матэрыялаў па раней забароненых тэмах: аб рэпрэсіях сярод мясцовага насельніцтва, голадзе, акцыях супраціву таталітарнаму рэжыму, калабарацыянізму ў гады Вялікай Айчыннай вайны, шляхах эміграцыі і інш. У выніку падобных навуковых даследаванняў з'яўляліся новыя зборы прадметаў. Так, у 2011–2012 гг. супрацоўнікі Капыльскага раённага краязнаўчага музея працавалі над праектам «Уклад у сусветную культуру ураджэнцаў Капыльшчыны, якія эмігравалі ў пачатку XX ст.». Праект быў скіраваны на выяўленне імёнаў землякоў-эмігрантаў, чыё жыццё ці дзейнасць былі звязаны з Беларуссю, у прыватнасці з Капыльшчынай. У працэсе маштабнага даследавання былі выяўлены разнастайныя прадметы пачатку XX ст. (друкаваныя выданні, фотаздымкі, дакументы і інш.), што ўвайшлі ў склад фондаў згаданага музея. На падставе сабраных матэрыялаў была таксама падрыхтавана перасоўная выстава на адпаведную тэматыку і брашура «Навекі пастаць сваю захаваўшыя...» [5].

Як ужо адзначалася, функцыя дакументавання праяўляецца таксама ў вывучэнні і захаванні ўжо наяўнага фонду музейных прадметаў. Фонды краязнаўчых музеяў з'яўляюцца спрыяльнай глебай для вывучэння, у першую чаргу, лакальна абмежаваных тэрыторый. З аднаго боку – гэта гістарычная і іншая праблематыкі канкрэтнага рэгіёна, яго адміністрацыйнага цэнтра, а таксама іншых больш дробных населеных пунктаў. А з другога – гэта гісторыя асобных структур рэгіянальнага ўзроўню (устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, навучальных устаноў і інш.), а таксама шырокі пласт генеалагічных пытанняў, якія ўключаюць як гісторыі асобных сем'яў, так і біяграфіі канкрэтных персаналій.

Для ўвядзення ў навуковы ўжытак вынікаў навукова-даследчай работы па вывучэнні музейных прадметаў і калекцый склаўся цэлы шэраг спецыфічных музейных форм. Найважнейшай формай публікацыі вынікаў даследавання музейнага збору з'яўляецца экспазіцыя, пастаянная ці часовая. Так, па выніках вывучэння кавальскага і ганчарнага рамяства, кавальскіх і ганчарных вырабаў з музейных збораў Нясвіжскага гісторыка-краязнаўчага музея былі створаны музейны аб'ект «Кузня» (у 2006 г.) і выстава «Гліняны звон з мінулага» (у 2013 г.).

Таксама вынікі даследаванняў друкуюцца ў выглядзе каталогаў калекцый, экспазіцый і выставак, пуцяводнікаў, зборнікаў навуковых артыкулаў і матэрыялаў, зборнікаў навукова-практычных канферэнцый і г.д. Так, напрыклад, у апошняе дзесяцігоддзе актывізавалася публікатарская дзейнасць Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Былі падрыхтаваны і выдадзены матэрыялы канферэнцыі «Віцебскія старажытнасці» (2010–2017), фотаальбом «Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: акупацыя і вызваленне» (2011), каталог калекцыі жэтонаў, прысвечаных вайне 1812 г. (2012), каталог калекцыі гем са збору музея (2013), каталог твораў мастака У. І. Вітко (2013), каталог «Ю. Пэн» (2016) і інш.

У мерапрыемствах па вывучэнні наяўных музейных прадметаў вялікае значэнне мае іх рэгістрацыя ў Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь (ДКМФ). Па даных на студзень 2019 г. у ДКМФ Рэспублікі Беларусь рэгіянальнымі краязнаўчымі музеямі краіны зарэгістравана 64515 прадметаў, што складае 39,8% ад агульнай колькасці зарэгістраваных там прадметаў [4].

Такім чынам, адной з базавых функцый краязнаўчых музеяў з'яўляецца функцыя дакументавання. Яна прадугледжвае адбор з акаляючай рэчаіснасці прадметаў, якія пацвярджаюць рэальнасць тых ці іншых падзей, што адбываліся на лакальнай тэрыторыі. Пасля ўключэння ў музейны збор сабраныя прадметы яшчэ ў большай ступені раскрываюцца ў працэсе вывучэння і навуковага апісання. На практыцы функцыя дакументавання рэалізуецца праз камплектаванне музейных фондаў, іх вывучэнне і захаванне.

**Літаратура**

1. Информация об итогах деятельности организаций культуры в 2017 г. и задачах на 2018 г. // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Афіцыйны сайт]. – Рэжым доступа: http://kultura.by/by/karysnaya-infarmacyya. – Дата доступа 28.10.2018 г.

2. Размустова, Т. О. Краеведческие музеи / Т. О. Размустова, А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. / Рос. ин-т культурологии МК РФ и РАН; Редкол.: В. Л. Янин (пред.) и др. – Москва, 2001. – Т. 1. – С. 298–301.

3. Сайфутдинова, В. Музейный проект этнокультурного изучения Мозырьщины «Шляхамі А. К. Суржпутоўскага» / В. Сайфутдинова Музей і традыцыйная культу-

ю Беларусі: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Гомель, 17–18 мая 2011 года) / [рэдкалегія: С. В. Разанаў (галоўны рэдактар), В. В. Дамаскаў, С. К. Кананові]. – Гомель, 2011. – С. 73–76.

4. Статыстыка ДКМФ // Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://dkmf.by/news/statystyka-dkmf2020. – Дата доступа 20.01.2020 г.

5. Шуракова, В. Л. О проеках / В. Л. Шуракова // Бягучы архіў Капыльскага раёна краязнаўчага музея.

## ВЫДАННІ КРАЯЗНАЎЧАГА ХАРАКТАРУ ПА ГІСТОРЫІ СЕННЕНШЧЫНЫ

***Бараноўскі Аляксандр Віктаравіч,***
*аспірант Інстытута гісторы НАН Беларусі,*
*магістр гістарычных навук,*
*г. Мінск*

Сярод даследчыкаў мінулага Сенненшчыны асаблівае месца належыць Кірылу Цімафеевічу Анікіевічу (2-я пал XIX ст. – пач. XX ст.). І колькі б ні мінула часу, пераўзысці яго дасягненні будзе амаль немагчыма. К. Ц. Анікіевіч вывучаў побыт беларускіх сялян, запісваў фальклор, вёў археалагічныя раскопкі, быў пастаянным карэспандэнтам Е. Р. Раманава ў час яго працы над «Белорусским сборником» (вып. 1–9, 1886–1912 гг.).

К. Ц. Анікіевіч перш за ўсё вядомы як аўтар працы «Сенненский уезд Могилевской губернии» [1]. Можна смела сказаць, што гэта першае манументальнае даследаванне Сенненшчыны. Яно ўбачыла свет у 1907 годзе ў Магілёве. Ідэйную накіраванасць даследавання вызначаюць словы эпіграфа: «Кто не желает знать своего отечества, тот не достоин называться его сыном» [1–2].

Праца краязнаўца складалася з 4-х разделаў. Першы прысвечаны фізіка-геаграфічнаму апісанню павета, асаблівасцям рэльефу, клімату, глебы. Другі раздзел утрымлівае звесткі пра гістарычнае мінулае краю, археалагічныя дадзеныя, рэлігійнае становішча ў павеце. Звесткі па культуры і быту насельніцтва Сенненшчыны згрупаваны аўтарам у трэцім раздзеле выдання. Прыводзячы падрабязныя звесткі аб колькасці насельніцтва павета па саслоўным, канфесійным і нацыянальным складзе, К. Ц. Анікіевіч апісаў жыллё, адзенне, сямейнае і грамадскае жыццё сялян, заняткі насельніцтва. Ён прыхільна ставіўся да народа, выхад з цяжкага становішча